**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2023 г.

2.07.2023

Літаратурна - музычная кампазіцыя "Я люблю Беларусь” была прысвечана Дню незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Бібліятэкар расказала прысутным, з чым звязана гэтае свята, калі яго пачалі адзначаць, нагадала гісторыю і традыцыі беларускага народа, пазнаёміла з паходжаннем назвы краіны – БЕЛАРУСЬ. Падчас мерапрыемства гучалі музычныя кампазіцыі пра Радзіму, пра прыгажосць родных мясцін. Была прадстаўлена кніжная выстава" Мы беларусы – мірныя людзі", якая выклікала цікавасць у большасці чытачоў і гасцей мерапрыемства.

Батчанская п/б, 23 чал.

*4.07.2023г.*

Падчас гадзіны разважання «Истории сильных духом» супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі навучэнцаў СШ №8 г. Кобрына з біяграфіямі людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія сталі сусветна вядомымі. Сярод такіх людзей: нямецкі музыка і кампазітар Людвіг ван Бетховен, пісьменнік М. Сервантэс, галандская тэнісістка Э. Вергеер, святая Матрона Маскоўская, легендарны лётчык, Герой Савецкага Саюза А. Марэсьеў, беларуская спартсменка, чэмпіёнка Паралімпійскіх гульняў Л.А. Воўчак, сляпы амерыканскі музыка С. Уандэр, мексіканская мастачка Ф. Кала і многія іншыя. Завяршылася мерапрыемства праглядам відэароліка«Не бойся быть собой!».

ЦРБ, 17 чал.

*5.07.2023г.*

Адбылася прэзентацыя юбілейнай выставы-партрэта «Гісторык, картограф, літаратар», прысвечанай 85-годдзю вучонага-гісторыка, даследчыка ў галіне гістарычнай геаграфіі і картаграфіі Беларусі, пісьменніка, выдаўца Льва Рамановіча Казлова. Выстава знаёміць з асноўнымі работамі Л. Р. Казлова, сярод якіх: навукова-папулярны альбом «Старажытная картаграфія Беларусі», выданне «Стагоддзі на картах», навукова-папулярны ілюстраваны «Гістарычны атлас Беларусі» і іншыя, якія раскрываюць талент нашага земляка як картографа.

ЦРБ, 37 чал.

*12.07.2023 г.*

У рамках школы бібліятэчнага майстэрства “Мабільны прафесіянал” адбылася творчая лабараторыя “Соцыякультурныя мерапрыемствы:  эфектыўнасць і якасць правядзення”. Удзельнікамі вучобы кадраў сталі бібліятэкары сістэмы. Асноўная мэта творчай лабараторыі — пошук новых шляхоў прыцягнення наведвальнікаў ў бібліятэку, вывучэнне і абагульненне инавацыйнага вопыта работы бібліятэк з рознымі катэгорыямі чытачоў.

ЦРБ, 28 чал.

*12.07.2023 г.*

Літаратурна-музычную кампазіцыю «Ад сэрца да сэрца» прадставілі члены аматарскага клуба Залескай публічнай бібліятэкі “Родник” у рамках провядзення святочных мерапрыемстваў з нагоды 110-годдзя храма святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла г. Кобрына. Члены клуба нагадалі прыхажанам гісторыю храма, уздаўшы хвалу першавярхоўным апосталам Пятру і Паўлу. Упрыгожыла свята выстава народнай творчасці і прадметаў старадаўняга побыту “Хата з матчынай душой".

Залеская п/б, 70 чал.

*14.07.2023г.*

Праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя “З Днём нараджэння, любімы горад!”, прысвечаная 736-годдзю г. Кобрына. У кампазіцыі знайшлі адлюстраванне: гісторыя горада, гераізм кобрынчан у гады Вялікай Айчыннай вайны і сённяшнія дасягненні горада. Вакальная група “Фантазія” цэнтральнай раённай бібліятэкі, Людміла Боцэх, клуб “Встреча” Кобрынскага ТЦСАН падарылі прысутным шмат прыемных і станоўчых эмоцый. Удзячныя гледачы цёпла прымалі артыстаў і дарылі ім бурныя апладысменты.

*ЦРБ, 41 чал.*

*23.07.2023 г.*

У час чарговага пасяджэння литаратурнага клуба «ПоэтиКо» адбылася прэзентацыя новай кнігі вершаў Алёны Котавай «Бабуліны рукі», якая атрымала перамогу ў конкурсе, арганизованым пружанскай районнай газетай «Раённыя будні» да 590-годдзя г. Пружаны.
У рамках мерапрыемства прайшла інфармацыйная гадзіна «Автор и закон». На пытанні па аўтарскаму праву и заканадаўстве ў сфере выдання книг и публикацый матэрыялаў у СМІ адказала кіраўнік клуба

«ПоэтиКо», выдаўца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Кандрашук.

ЦРБ, 12 чал.

*25.07.2023г.*

Літаратурна-музычная вечарына "Струна, звучащая стихами" была прысвечана дню памяці Уладзіміра Высоцкага. На сустрэчы падапечныя аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН пачулі вядомыя і любімыя музычныя і паэтычныя творы пра каханне, сяброўства, радзіму. З творчым шляхам паэта пазнаёмілі прысутных супрацоўнікі бібліятэкі: паказалі ўрыўкі з савецкіх мастацкіх і дакументальных фільмаў з удзелам Уладзіміра Высоцкага, фрагменты канцэртаў, спектакляў.

ЦРБ, 23 чал.

На працягу ліпеня праводзіліся мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў у рамках сацыякультурнага праекта "Объединить, заинтересовать, увлечь". Библиятэки раёна праводзяць квесты, конкурсы, виктарыны, спаборництвы и г. д.

Выканаўца Галавейка Т. А.
Тэл. 3 85 81